**УДК 94(476).001.5**

# КРЫМІНАЛ І МАХЛЯРСТВА Ў ГАНДЛЁВЫХ АДНОСІНАХ ПАМІЖ ПОЛАЦКАМ І ГАНЗЕЙСКІМ САЮЗАМ У ХІІІ – ПАЧАТКУ XVI стст.

***д-р гіст. навук У.А. ЛОБАЧ***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*У артыкуле разглядаюцца розныя спосабы махлярства, а таксама крымінальныя злачынствы ў сферы міжнароднага гандлю паміж Полацкам і гарадамі Ганзейскага саюзу. На працягу ўсёй гісторыі гандлёвых узаемаадносін найбольш характэрнымі злачынствамі з'яўляліся рабаванне, крадзеж, маніпуляцыі з шалямі, ухіленне ад вяртання грашовых пазык і таварных крэдытаў, фальсіфікацыя тавараў і нелегальны гандаль, а таксама падробка грошай.*

***Ключавыя словы:*** *Полацк, Ганзейскі саюз, гандаль, крымінал, махлярства, тавар, грошы.*

**Уводзіны**. Міжнародны гандаль у басэйне Заходняй Дзвіны пачаў актыўна развівацца яшчэ ў X – XI стст., калі рака стала вельмі важным адгалінаваннем "шляху з вараг у грэкі", які звязваў Паўночную Еўропу з Візантыяй. Экспансія нямецкіх рыцараў і заснаванне Рыгі на вусці Дзвіны ў пачатку XIII ст. істотным чынам змяніла канфігурацыю гандлёвых адносін і іх інтэнсіўнасць. Галоўным гандлёвым партнёрам "рускіх" гарадоў у рэгіёне – Полацка, Віцебска, Смаленска – становіцца Ганза (буйны эканамічны і палітычны саюз гарадоў Паўночна-Заходняй Еўропы), дзе прыярытэтнае значэнне ў басейне Заходняй Дзвіны атрымала Рыга. Розныя аспекты міжнароднага гандлю знайшлі сваё адлюстраванне ў шматлікіх дамовах, заключаных паміж Полацкам і Рыгай. У той жа час, развіццю гандлёвых аперацый спадарожнічалі разнастайныя спосабы махлярства, а таксама крымінальныя злачынствы ў галіне абароту тавараў і фінансаў, пра што сведчаць пісьмовыя крыніцы XIII – XVI стст.

**Асноўная частка**. Пытанне ролі і значэння Полацка ў ганзейскім гандлі прыцягнула ўвагу даследчыкаў яшчэ ў XIX стагоддзі. Вялікае значэнне для асвятлення разнастайных аспектаў гандлёвых узаемадачыненняў паміж Ганзай і ўсходнеславянскімі гарадамі (Ноўгарадам, Полацкам, Псковам) мелі крыніцазнаўчыя пошукі Карла-Эдуарда Нап'ерскага, які адшукаў у архівах Рыгі абшырны корпус актаў (дамоў, грамат, лістоў), датычных эканамічных стасункаў у рэгіёне Паўночна-Усходняй Балтыі [1; 2]. На падставе выяўленых дакументаў Іван Ціхаміраў публікуе (1877) першае, адносна невялікае і агляднае па характары, даследаванне гандлёвых сувязяў паміж Полацкам і Лівоніяй у XIV ст. [3]. Куды больш грунтоўны характар мела праца Германа Гільдэбрандта, прысвечаная дзейнасці ганзейскай гандлёвай канторы ў Полацку, дзе значная ўвага надавалася і разнастайным махінацыям, як з боку нямецкіх, так і полацкіх купцоў [4]. Сцісла, але змястоўна характарызуе спецыфіку гандлю паміж палачанамі і немцамі Васіль Данілевіч (1896), пазначыўшы адной з галоўных праблем узаемны гвалт і рабункі, што мелі месца ў XIII – XIV ст. [5, с. 215 – 227]. Розныя аспекты развіцця гандлёвых адносін паміж Ганзай і славянскімі землямі разглядаў у сваім фундаментальным даследаванні "Нарыс гісторыі рускага гандлю" (1923) Іосіф Кулішэр, які прысвяціў асобны раздзел Полацку, Віцебску і Смаленску [6, с. 113–132].

Значны ўнёсак у распрацоўку пазначанай праблематыкі быў зроблены Г.Л. Харашкевіч, намаганнямі якой у 1977 – 1989 гг. свет убачыла 6-томнае выданне полацкіх грамат XIII – XVI стст., а таксама шэраг навуковых артыкулаў, прысвечаных гандлёвай гісторыі Полацка [7; 8]. На спецыфічную тэму – фальшаванне палачанамі лівонскіх шылінгаў – звярнуў увагу вядомы беларускі нумізмат В.Н. Рабцэвіч [9, с. 95–96; 10, с. 115]. Гэтая ж праблема была закранута ў публікацыях Д.У. Дука [11], І. Колабавай [12], а таксама Д. Гулецкага [13]. У сучаснай беларускай гістарыяграфіі гандлёвыя сувязі паміж Полацкам і Ганзай даследуе Д.В. Жарын [14; 15; 16]. Разам з тым, аналіз навуковых прац, якія тым ці іншым чынам закранаюць эканамічнае і прававое ўзаемадзеянне Полацка і Ганзейскага саюза, паказвае, што праблема крымінальных аспектаў і махлярства ў сістэме міжнароднага гандлю ўзгадвалася спарадычна і сістэмна не разглядалася, што абумовіла актуальнасць асобнага даследавання ў дадзеным накірунку.

Гандаль у розных відах і формах яго практычнай рэалізацыі з'яўляецца найважнейшай сферай гаспадарчай дзейнасці любога грамадства на ўсіх этапах гістарычнага развіцця. Кажучы пра міжнародны сярэднявечны гандаль Еўропы, варта адзначыць, што яго прагматыка мела не толькі эканамічнае вымярэнне, але ў значнай ступені прадукавала важкі культурны эфект: ад ментальнага пашырэння і ўзбагачэння карціны свету гандлёвых партнёраў да ўзаемаўплываў у вобласці культуры, мовы, права, моды, гастраноміі і розных побытавых практык. Зваротным бокам гандлю, накіраваным на куплю / продаж або абмен таварамі і атрыманне матэрыяльнай выгады пры гэтым, з'яўляецца сістэма махлярскіх прыёмаў і дзеянняў, якія маюць мэтай максімальны прыбытак, атрыманы ў выніку свядомага парушэння актуальнага прававога поля і існых у дадзены гістарычны перыяд норм гандлёвай этыкі. Несумнеўным з'яўляецца

і той факт, што гісторыя развіцця гандлёвых адносін – гэта, адначасова, і гісторыя ўдасканалення незаконных спосабаў атрымання прыбытку ў сферы гандлю: ад брутальнага рабавання, часта спалучанага з забойствам і фізічным гвалтам, да мудрагелістай падробкі грашовых сродкаў. Дадзены тэзіс знаходзіць сваё пацвердджанне пры аналізе гістарычных крыніц, якія адлюстроўваюць развіццё міжнародных гандлёвых адносін у басейне Заходняй Дзвіны ў перыяд XIII – перш. пал. XVI ст.

Практычна ўсе дамовы, заключаныя ў азначаны перыяд паміж флагманам ганзейскага гандлю ў рэгіёне – Рыгай і ўсходнеславянскімі гарадамі Полацкам, Віцебскам і Смаленскам, утрымліваюць шматлікія артыкулы, што прадпісвалі пакаранне за розныя спосабы нядобрасумленнага гандлю і злачынствы ў дадзенай сферы. Паколькі ўсе нормы, законы і ўсталяванні маюць сэнс і актуальнасць толькі на фоне іх парушэння, несумнеўна, што махлярства рознага роду з'яўлялася сталай праблемай у гандлёвых статунках паміж ганзейскімі і славянскімі купцамі. Пра гэта сведчаць і шматлікія ўзаемныя скаргі контрагентаў, якія захаваліся ў гарадскіх архівах Рыгі [1; 17; 18].

Заходняя Дзвіна (Даўгава) актыўна функцыянавала ў якасці гандлёвай магістралі яшчэ ў X – XI стст., уяўляючы сабою важнае адгалінаванне "шляху з вараг у грэкі", што злучаў Паўночную Еўропу і Візантыю. У наступныя стагоддзі значэнне воднай артэрыі ў гандлі паміж Заходняй Еўропай і славянскім светам паступальна ўзрастае, пра што сведчаць велізарныя аб'ёмы тавараабароту, адлюстраваныя ў гістарычных крыніцах, а таксама вялікая колькасць гандлёвых дамоў, заключаных паміж ганзейскімі гарадамі і Полацкам, Віцебскам, Смаленскам – з другога боку. Шырокі корпус дакументальных сведчанняў пра міжнародны гандаль у басейне Заходняй Дзвіны дае выразнае ўяўленне пра характар махлярства ў гэтак прыбытковым бізнэсе і тыповыя злачынствы, якія спадарожнічалі гандлёвым аперацыям.

Міжнародны еўрапейскі гандаль эпохі ранняга сярэднявечча ўяўляў сабой прыбытковы, але скрайне рызыкоўны занятак, калі тагачасны купец адначасова з'яўляўся воінам. У карціне свету еўрапейцаў IX – XI стст. вобраз гандляра з мячом у руках найбольш яскрава ўвасобілі варагі (вікінгі), што актыўна спалучалі гандаль і абмен з узброеным гвалтам і рабаўніцтвам у адносінах да мясцовага насельніцтва. Вельмі трапна ахарактарызаваў спецыфіку раннесярэднявечнага гандлю А.Я. Гурэвіч: "Купец ранняга перыяду – персанаж, які радыкальна адрозніваўся ад купца развітага і позняга сярэднявечча. У гэтым сэнсе паказальныя тыя гандлёвыя людзі, што дзейнічалі ў Паўночнай Еўропе ў эпоху вікінгаў. Вікінг – ваяр, захопнік, рабаўнік, адважны мараход і каланізатар. Ад нападаў скандынаўскіх вікінгаў пакутавалі жыхары Францыі, Англіі, Старажытнай Русі і Міжземнамор'я. <…> Сярод шматлікіх знаходак эпохі вікінгаў археолагамі знойдзены нароўні са зброяй шалі з гірамі, якімі карысталіся скандынаўскія мараплаўцы. Далёка не ўсе шматлікія скарбы срэбных і залатых манет, выяўленыя на Поўначы, склаліся ў выніку рабаванняў – частка грошай была атрыманая падчас мірнага гандлёвага абмену. Але, як вынікае з ісландскіх саг, гандлёвая паездка скандынава нярэдка завяршалася яго нападам на мясцовых жыхароў, і тое, чаго ён не мог вымяняць, ён адымаў у іх сілай. Гандаль і рабаўніцтва ішлі поруч" [19, с. 98].

Пачатковы этап станаўлення гандлёвых сувязяў паміж ганзейскімі гарадамі і Полацкам (Віцебскам, Смаленскам) меў палітычным кантэкстам узброеныя канфлікты паміж Ордэнам мечаносцаў (Рыга) і Полацкім княствам, у выніку якіх палачане згубілі кантроль над Ніжнім Падзвіннем. Гандлёвае пагадненне паміж Рыгай і Смаленскам (Полацкам, Віцебскам) у 1229 г., вядомае як "Смаленская гандлёвая праўда", было пагадненнем паміж учорашнімі ворагамі – тэкст дамовы выдатна адлюстроўвае атмасферу гвалту, уласцівую тагачаснаму гандлю. Паказальна, што прэамбула і першыя артыкулы дамовы прысвечаны не ўнармаванню ўласна гандлю, а праявам фізічнага гвалту ў адносінах да асобы (забойствы, прычыненне ран, катаванні, згвалтаванні) і спосабам пакарання за іх. Там утрымліваецца паказальная фармулёўка: "*Бог того не дай, оже **разбои** (тут і далей вылучана мной – У.Л.) по грехомь пригодиться межи Немци и межи Руси, что за что платити, абы мир не разрушон, абы Русину и Немичу любо было*" [20, с. 58]. Пра тое, што ўзгаданы "разбой" быў неад'емна звязаны з фізічным гвалтам, гаворыць 2-я рэдакцыя дамовы: "*Того Бог не дай, аж бы промьжю нами бой был, а любо **человека оубиють до смерти**, како человека то оплатити, аж бы мир не ръздроушенъ былъ*" [20, с. 58]. Звяртае на сябе ўвагу і 10 артыкул, які паказвае, што тагачасныя канфліктныя ці спрэчныя сітуацыі паміж купцамі часта вырашаліся не шляхам перамоў, але з дапамогай зброі. "*Русину не звати Латинана на поле бится у Рускои земли; а Латинину не звати Русина на поле бится у Ризе и на Готском березе*"; "*Или Немечьскыи гость иметься бити межю собою мечи в Руси, или сулицами, князю то не надобе, никакому Русину, ать правяться сами по своему суду. Та же правда буди Руси в Ризе…*" [20, с. 61].

Гвалт і рабаўніцтва, звязаныя з забойствам купца, фіксуюцца ў гістарычных крыніцах даволі рэдка, бо былі выпадкам, хутчэй, экстраардынарным. Тым не менш, "у 1227 г. лівонскія ландсгеры выдалі распараджэнне аб пераносе кірмашоў з Русі ў Лівонію, пры гэтым выклікана гэтае распараджэнне было тым, што пры праездзе купцоў па Дзвіне на іх нападалі рускія, забівалі, рабавалі тавары і наогул чынілі розны гвалт" [5, с. 222]. У сваю чаргу, у 1286 г. "*Витьбляне жялобилися на Рижяны… и рекли такъ предъ княземъ Бряньскымъ: выехали восем мужъ изъ Ригы и убили чоловека, и узяли десять бърковъсковъ*[1] *воску…*" [2, с. 18].

[1] **Беркавец** – адзінка меры, роўная 10 пудам – каля 164 кг.

Каля 1448 г. палачане патрабавалі ад рыжскіх улад пакарання дынабургскага (невгінскага) комтура за забойства "*полочанина, доброго местича на имя Грица*", патрабуючы, каб магістр Лівонскага ордэна "*того оубийцу держалъ твердо…, аж бы промежю нами большого смутку не было*" [17, с. 170].

**Рабаўніцтва купцоў**, часта з выкарыстаннем фізічнага гвалту, было куды больш распаўсюджаным злачынствам у сферы гандлёвых адносін Ганзы і Полацка, Віцебска, Смаленска ў XIII – першай палове XVI стст. Практыкавалі злачынны спосаб узбагачэння як "немцы", так і "рускія", як шараговыя месцічы ці купцы, так і прадстаўнікі сацыяльнай эліты – князі, магістры, комтуры. Напрыклад, у 1270-х гадах нямецкія гандляры звярнуліся са шматлікімі скаргамі да віцебскага князя Канстанціна Міхайлавіча, дзе асабліва акцэнтаваліся непрыхаваныя рабункі ганзейскіх купцоў па загадзе ўласна князя альбо на падуладнай яму тэрыторыі. "*И потомъ ты дѣтьскые свои пославъ на его (Фредрика – У. Л.) подворие, и велелъ еси товаръ его розграбити, на 4 капи воску. И ныне мы сами тобе молимъ, абы ты тыи товаръ отдалъ, княжо*"; "*Как-то было нашей братии поехати из Витобеска у Смоленск, тогды Литва изымали их на пути, у твоем городе, княжо, вязали их, и мучили, и товар отымали в них. А у твоеи волости ся то дѣяло. Товара взяли ту на 70 гривенъ серебра…*" [2, с. 27].

Неаднаразова на рабаўніцтва сваіх купцоў на землях Лівоніі скардзіліся і палачане. Ініцыятарамі злачыннага промыслу мог выступаць сам магістр Лівонскага ордэна, альбо комтуры Дынабурга (Невгані). У 1446 г. полацкі наместнік пісаў рыжскім ратманам: "*Купцы князя великого полочане били нам челом, а поведають, што князь ваш мештерь полочаном у Ризе торговати не дал, а еще и товар у них пограбил и суды отымал.., што пеши пришли к Полоцку*"; "*А также у Невгини у полочан товар трясуть а грабять…*" [17, с. 160]. Шматлікімі былі выпадкі рабаўніцтва полацкіх купцоў і ўласна ў Рызе. Каля 1444 г. полацкі наместнік Іван Гойцавіч наракае рыжскаму магістрату: "*Ино слышим от людей, што есте пограбили правых людей полочан, тым не хотите вернуть их товару*" [17, с. 149]. Але пры гэтым, у грамаце агучваецца кампенсацыйны прынцып вырашэння падобнага канфлікту (*вока за вока*), калі страты, нанесеныя палачанам у Рызе, мусілі вярнуць нямецкія купцы з полацкай ганзейскай канторы. "*Ино коли починаете грабити правых людей, ино мы тѣж… державъ ваших купцев и мы велим за свое побрати, тогда будем на обѣ сторонѣ смотрити права*" [17, с. 149]. Прынцып карпаратыўнай (калектыўнай адказнасці) пастаянна ўзгадваецца ў граматах канца XIV–XV стагоддзя як фактар, які меў абмежаваць рабункі і махлярства з абодвух бакоў і, як сведчаць гістарычныя крыніцы, актыўна выкарыстоўваўся на практыцы. Як адзначае Г. Гільдэбранд, "амаль ва ўсіх дамовах паміж Рыгай і Полацкам ёсць вядомая пастанова, што ў выпадку спрэчак паміж рускімі і немцамі абодва бакі не павінны прыцягваць да суда недатычных да справы асобаў. Але менавіта гэтая пастанова часцей за ўсё парушалася. Калі здаралася, што немец ад'язджаў, не заплаціўшы сваіх пазык рускім, то рускія спаганялі пазыку з першага сустрэчнага ягонага земляка. Калі ў Рызе рускі меў страты, то ў Полацку з немцаў патрабавалі кампенсацыі за гэтыя страты. <…> Аднойчы ў Лівоніі ў нейкага рускага адабралі пару коней: полацкая кантора павінна была заплаціць за адабранае. "За гэта прыйдзецца адказваць альбо мне, альбо некаму іншаму", – піша эльтэрман у Рыгу" [4, с. 64].

Зразумела, што падобны, рабаўніцкі па сутнасці, метад кампенсацыі страт, панесеных ў Полацкай зямлі, практыкавалі і нямецкія гандляры ў Рызе. Пры гэтым, значнасць падобных канфліктаў была нагэтулькі маштабнай, што разглядаліся яны на вышэйшым дзяржаўным узроўні – вялікімі князямі літоўскімі. Яшчэ ў 1397 г. Вітаўт паведамляе рыжскаму магістрату ў грамаце: "*И если ваши купцы задержаны в Полоцке, в городе, то спросите у своего магистра, почему он напал на полочан… И мы сообщили вам, что если полочанам в скором времени не будет возмещен ущерб, то может случиться, что эти самые ваш купец и их товары никогда не вернутся*" [17, с. 71]. У 1461 г. у справе рабаўніцтва тавараў полацкага купца разбіраецца вялікі князь літоўскі Казімір: "*Ратманомъ ризским. Жаловалъ намъ полочанинъ Иевко на Якубця Кгинивиловича, пограбилъ деі его невинно, взялъ оу него солью, грошми, всего на пятнадцать рублевъ за Балагура, а тот Балагуръ живъ есть оу нашоі земли*" [17, с. 205].

Звяртае на сябе ўвагу тая акалічнасць, што шматлікія скаргі палачан на рабункі з боку немцаў утрымліваюць не толькі пералік панесеных матэрыяльных страт, але і акцэнтаваныя ўказанні на "*соромоты*" – знявагі і абразы, учыненыя гандлёвымі партнёрамі. У чым менавіта заключаліся маральныя страты палачан паказвае грамата полацкага наместніка ў Рыгу (каля 1484 г), дзе той паведамляе, што "*жаловал нам полочанин наш Санко Маркович на вашего рижанина на Радивона на Ламаря, што ж силно отнял у него ласт попелу и самого збил и* ***бороду вырвал***" [18, с. 66]. Пра тое, што шкода нанесеная барадзе полацкага купца была далёка не адзінкавым выпадкам, сведчыць грамата ваяводы полацкага Алехны Судзімонтавіча ў Рыгу у 1466 г.: "*Ино вси ся жалують на ваших о своих великих шкодахъ и соромоте и боювъ невымовныхъ и* ***бородъ рѣзанья***" [18, с. 16]. Барада як аб'ект гвалту з боку немцаў у дадзенай сітуацыі фігуруе зусім не выпадкова, бо менавіта ў культуры ўсходніх славян яна мела надзвычай важнае сімвалічнае значэнне – выступала як атрыбут Бога (і ў сваю чаргу, як знак далучанасці чалавека да боскай волі і спагадлівасці), маркёр мужчынскасці, сімвал плоднасці і багацця, а таксама выконвала функцыі апатрапея – ахоўвала свайго гаспадара ад магчымых бедстваў. У Кіеўскай Русі вырыванне ці гвалтоўнае абразанне барады трактавалася законам як адно з самых цяжкіх зняваг мужчыны і каралася вялікім штрафам у 12

грывен срэбра (у такую ж суму ацэньвалася забойства княжацкага старасты) [21, с. 81, 83]. У той жа час, "у адрозненне ад праваслаўнага ўсходу Еўропы звычай насіць бараду значна менш быў распаўсюджаны на каталіцкім Захадзе" [22, с. 41]. Такім чынам, адразанне і вырыванне барод у полацкіх купцоў ва ўладаннях Лівонскага ордэна ці ў Рызе не былі выпадковымі хуліганскімі дзеяннямі, але з'яўляліся свядомымі актамі грубай знявагі прадстаўнікоў іншай культурнай традыцыі. У сваю чаргу, падобны акт дыскрэдытацыі асобы паказвае на этнакультурную падаплёку шматлікіх гандлёвых канфліктаў паміж нямецкімі і полацкімі купцамі, калі маральна-этычныя ўсталяванні, прынятыя ў "сваёй" супольнасці, з'яўляюцца нерэлевантнымі ў адносінах да "чужынцаў".

Зразумела, што негатыўнае ўспрыняцце, недавер і падазронасць у ганзейскіх і полацкіх купцоў былі ўзаемнымі, чаму спрыялі перманентныя ваенныя канфлікты паміж Лівонскім ордэнам і Вялікім Княствам Літоўскім і Полацкам у прыватнасці. "На працягу ўсяго XIV стагоддзя крыжакі неаднаразова імкнуліся захапіць горад і землі, якія яму належалі. Рыцары Лівонскага ордэна хадзілі на палачан паходамі ў 1324 (двойчы), 1325, 1333, 1334, 1343, 1366, 1374, 1375, 1377, 1382 і 1386 годзе" [23, с. 123]. На заканадаўчым узроўні дэкларавалася, што ў выпадку ваеннага канфлікту паміж Тэўтонскім (Лівонскім) ордэнам і Вялікім Княствам Літоўскім, купцы з абодвух бакоў захоўвалі права вольнага перамяшчэння і гарантыю недатыкальнасці сваіх тавараў, як тое было пазначана ў Капыскай гандлёвай дамове 1406 г.: "*Далее если же какая-нибудь обида, вражда или ссора возникнет между нами и почтенным господином Конрадом фон Фитигнгофе, магистром Тевтонского ордена в Ливонии, нашими наследниками, землями или подданными с обеих сторон, купцы должны оставаться незамешанными в это, и купцы с обеих сторон должны быть уверены в своей жизни и имуществе, и война не должна касаться их…*" [17, с. 106]. Але ў рэальным жыцці ментальна адмежаваць вобраз нямецкага купца ад вобраза ворага для палачаніна было практычна немагчыма. "Калі ўзнікала варажнеча ў Ліфляндыі, мірныя дамовы забываліся і ў нямецкіх купцах бачылі суайчыннікаў і саюзнікаў ордэна, з якім даводзілася ваяваць. На нямецкім купецтве помсціліся за ўдары, якія наносіў ордэн" [4, с. 65]. Ва ўмовах вайны, нягледзячы на існыя дамовы і пагадненні, становішча купца на варожай тэрыторыі (немца – у Полацку, рускага – у Лівоніі) станавілася хісткім і абсалютна няпэўным. Невыпадкова, што "ўсякія, нават неабгрунтаваныя, чуткі пра вайну наводзілі на купцоў панічны жах. <…> Натуральна, як толькі становішча станавілася пагрозлівым, Рыга імкнулася папярэдзіць нямецкіх купцоў, каб яны спяшаліся збываць свае тавары і непрыкметна ад'язджалі з Полацка. <…> Не заўсёды, аднак, перасцярогі дапамагалі. Рускія паспявалі нападаць на кантору і забіралі тавары. Палонныя немцы служылі закладнікамі бяспекі рускіх, што апынуліся, магчыма, у рыжскім палоне. Захопленыя тавары служылі ўзнагародай за страты, што нанесла вайна рускім гандлярам" [4, с. 65–66].

**Крадзеж** як від крымінальнага злачынства, які суправаджае ўсю гісторыю гандлю, не з'яўляўся выключэннем і для гандлёвых адносін у басейне Заходняй Дзвіны XIII – пач. XVI стст. Смаленская гандлёвая праўда 1229 г. прадугледжвала самасуд над злодзеям, які быў злоўлены на месцы злачынства. "*Аще Русин или Немчичь, иметь татя у своего товара, в томь его воля [что хочеть учинити]*" [20, с. 68]. Але з XIV ст. права юрысдыкцыі, незалежна ад месца і віда здзейсненага злачынства, перадавалася "роднаму гораду" злачынцы: палачан мусілі судзіць у Полацку, рыжан – у Рызе паводле мясцовага заканадаўства. Так, у 1481 г. полацкі намеснік нагадвае рыжскім уладам пра неабходнасць выдаць палачан, злоўленых на крадзяжы срэбра ў Рызе: "*Ваша милость писали до нас, што ж наших полочан держите в себе в поиманьи в татьбе о серебро, а до нас не шлете. А сами… о том добро ведаете, што ж вам рижаном наших полочан… в Ризе не сажати, слати вам до нас, и мы их, досмотревши исправа, скараем подлуг их заслуги. А нам, полочаном, вашого рижанина, в чом коли проступить, в которой татьбе в Полоцку, нам его не казнити, слати нам его к вам и с тою татьбою, ино вам его казнити по своему праву*" [18, с. 96].

**Махлярства** ў сферы гандлю мела большуюварыятыўнасць і распаўсюджанасць, чым крымінальныя злачынствы. Аналіз пісьмовых крыніц дазваляе вылучыць некалькі асноўных тыпаў нядобрасумленных прыёмаў пры здзяйсненні гандлёвых аперацый паміж ганзейскімі і полацкімі купцамі.

**Маніпуляцыі з шалямі** (абважванне пакупніка ці прадаўца тавара) з'яўляліся пастаяннай праблемай у гандлёвых узаемаадносінах Полацка і Рыгі, што змушала заключаць адмысловыя дамовы і пагадненні. Так, паводле дамовы полацкага князя Глеба з лівонскім магістрам і горадам Рыгай адносна парадку гандлю вагавымі таварамі (каля 1338 – 1341 гг.) вагаўшчык быў абавязаны цалаваць крыж, тым самым абавязваючыся быць сумленным пры ўзважванні тавара, а таксама пазбягаць маніпуляцый з шалямі. "*А весцеви крест целовати, как ему право весити, какие ни товар будеть; А коли товар на стану станеть, оступи прочь, а рукою не примай*" [17, с. 40].

Аднак заключаныя дамоўленасці пастаянна парушаліся з абодвух бакоў. Каля 1407 г. палачане скардзіліся на неадпаведнасць рыжскіх шаляў полацкім, у выніку чаго полацкія купцы неслі страты пры продажы воску і куплі срэбра [17, с. 86–87]. Адпаведна, прадстаўнікі нямецкай канторы абураліся маштабным вагавым махлярствам у Полацку. "Ужо ў 1408 г. полацкая кантора паведаміла магістрату, што трое шаляў маюць недахопы, чацвёртыя ж шалі, па меркаванні рускіх, дакладныя, але ў іх… зроблена прабоіна такая вялікая, што праз яе можна прасунуць кулак. Гэту прабоіну рускія затыкнулі кавалкам свінцу, вагай у два

рынкавых фунта, якi цi вымаюць, цi ўстаўляюць, гледзячы па абставiнах" [4, с. 58]. Шматлiкiя двухбаковыя скаргi не спынялi злоўжыванняў, i ў 1459 г. "*бояре полоцкие и местичи… жаловались королю… о великие свои кривды и шкоды, и о соромоты, которые ж деются от ваших рижан полочаном как* ***у весах****, та иньи новины неподобныи ново уведенены…*" [17, с. 202]. Памеры страт, панесеных нямецкiмi купцамi ад манiпуляцый палачанаў з шалямi, былi нагэтулькi значнымi, што ганзейскiя гандляры мусiлi на пэўны час прыпыняць продаж сваiх тавараў, як гэта вынiкае з лiста полацкай канторы ў Рыгу, датаванага пачаткам XV ст.: "*Мы уже не раз писали к вам о неверности весов; теперь они хуже, чем когда-либо и с каждым днем ухудшаются. Это причиняет нам такой убыток, что мы предпочитаем товар наш оставлять по целым годам в амбарах непроданным, чем дозволять русским обкрадывать нас столь явным образом*" [4, с. 59].

На злосныя парушэннi ў справе ўзважвання тавараў вымушана была рэагаваць i вярхоўная ўлада Вялiкага Княства Лiтоўскага, пакольку ад падобнага махлярства цярпела не толькi рэпутацыя полацкiх купцоў у цэлым, але i гандлёвы зварот памiж ВКЛ i краiнамi Захаду. Так, у сваёй грамаце рыжскаму магiстрату (каля 1400 г.) вялiкi князь лiтоўскi Вiтаўт пазначае: "*Далее знайте, что нам сообщили, что в Полоцке ведали весами неприсяжные весцы, и что поэтому взвешивали купцам неодинаково. Теперь же мы постановили, что никто не должен взвешивать, не дав предварительно клятвы, и если же вопреки его клятве он [взвешивает] неправильно, он должен быть судим*" [17, с. 65]. Аднак, калi прыняць пад увагу велiзарныя аб'ёмы тавараў, што падлягалi ўзважванню (найперш, воск i соль), то нават невялiкае наўмыснае адхiленне шаляў ад нормы прыносiла зламыснiкам адчувальныя прыбыткi практычна без усялякiх затрат з iх боку. Гэтая акалiчнасць i абумовiла ўстойлiвы характар манiпуляцый з шалямi, якiя фiксуюцца на працягу ўсёй гiсторыi гандлёвых адносiн Полацка i ганзейскiх гарадоў.

**Фальсiфiкат**. Падробка i продаж няякасных тавараў гэтаксама з'яўлялiся адной з ключавых праблем у сярэднявечным гандлi ў басейне Заходняй Дзвiны. У XIII – XIV стст. благi тавар у пiсьмовых крынiцах называўся "нячыстым", "лiхiм" i купцу, якi яго прывёз на продаж, прадпiсвалася вярнуцца дадому. "*Аже привезеть нечистый товар, а нелюб будеть, поехати ему назад со своим товаром*" [17, с. 41]. Але ў XV ст. з'яўляюцца адмысловыя тэрмiны ў адносiнах як да фальсiфiкаваных тавараў (*хвальш*), так i да гандляроў, што iх прадавалi (*хвальшнiкi*, *хвальшеры*). Пры гэтым, абвiнавачаны ў продажы няякаснага тавара купец падлягаў суду i штрафным санкцыям у сваiм горадзе: рыжанiн – у Рызе, палачанiн – у Полацку. Так, у 1463 г. вялiкi князь лiтоўскi Казiмiр у сваёй грамаце рыжанам выказвае недаўменне па прычыне iх недаверу да якасцi полацкага воску, пазначыўшы, што вiнаватыя строга караюцца ў Полацку. "*Бурмистру и ратманомъ Ризского мѣста. Што первѣи сего писали есмо к вам о купци наши о полочане, абы есте брали оу нихъ воскъ за тою печатью, што мы имъ на то дали, вы пакъ ди еще ихъ воскъ колупаете и печать свою ризскую къ ихъ воску прикладаете. Нам ся видить то, как бы ещо имъ в томъ не довѣряете, а вед жо* ***хто су Полотску воскъ фалшевалъ, тых полочане ихъ правомъ сказнили****. А ваши рижане то видѣли*" [17, с. 206]. Грамата полацкага ваяводы ў Рыгу (1464 г.) прасвятляе акалiчнасцi фальшавання воску ў Полацку: судовае разбiральнiцтва, iнiцыяванае рыжанамi, выявiла, што ў падробцы стратэгiчнага экспартнага тавару прымала ўдзел баярская вярхушка гораду: "*Перед тем ваша милость писали о фальш, ижь у воску была великая несправедливость от фальшерев. <…> и мы того, седше, осмотрили с осподоря нашого мещаны полоцкими, ижь то не мещаны деють такий фальш и неучтивость, аль боярскими людьми. И мы виноватых внашодше вкарали…*" [17, с. 216].

Меры па барацьбе з фальсiфiкатарамi тавараў прадпрымалiся i ўладамi Рыгi. Яшчэ ў 1338 г. была прынята пастанова, якая рэгулявала правiлы гандлю для нямецкiх купцоў у верхнiм Падзвiннi. Паводле яе, любы нямецкi купец, злоўлены ў канторы на верхняй Дзвiне на прывозе падробленага тавару, мусiў быць адпраўлены ў Рыгу i аддадзены пад суд [4, с. 56–57]. Аднак, як заўважае Г. Гiльдэбранд, "выгоды, якiя прыносiў падман, былi нагэтулькi вялiкiмi i такiмi спакушальнымi, што самыя высокiя штрафы не маглi спынiць падману" [4, с. 56].

Натуральным чынам, прадметам фальсiфiкацыi з'яўлялiся асноўныя групы экспартных тавараў з абодвух бакоў. Недабрасумленныя полацкiя гандляры спецыялiзавалiся на продажы сапсаванага футра i няякаснага воску. "Вядома, што ўжо ў XIII ст. падробка тавараў была справай звычайнаю. Так, напрыклад, у воск падмешвалi смалу, сала, пясок, гарохавую i жалудзёвую муку, нават камянi, старое жалеза; да мехавых тавараў у цюках устаўлялi непрыдатнае футра. Каб не рабiцца ахвярай падобных падманаў, нямецкiя купцы павiнны былi прывозiць закупаемы воск да сябе i засведчыць яго якасць пастукваннем цi пракалваннем, а мехавы тавар, якi пераўзыходзiў 250 штук, павiнны былi дома падвергнуць падрабязнаму агляду. Пры куплi больш за 1000 штук, купцы павiнны былi прыводзiць з сабою да агляду асаблiвых сведкаў" [4, с. 55]. Фальсiфiкацыя ж з боку ганзейскiх купцоў у першую чаргу датычылася сукна, солi i селядцоў – гэтая трыяда тавараў пастаянна фiгуруе ў скаргах палачанаў: "*Не первое вам пишем, што ж* ***чините хвальш в сукне, а в соли, а в селедцех***" [17, с. 184]. Асаблiва часта нараканнi датычылiся продажу сапсаванага селядца цi рознага махлярства пры збыце рыбы, гэтак любiмай беларусамi як у сярэднявеччы, так i ў наш час. У грамаце полацкага намеснiка Грыгорыя (каля 1420 г.) прыводзiцца скарга палачанiна Якава на рыжан, што падманулi яго пры продажы селядца: "*Жаловался намъ*

*нашь полочанин Яков на ваши нѣмъци на Ивана да на Еремея, што жъ купил оу них селѣдьци. Ино оу тых селедьцов одна бочька лиха зъ дерѣвьемъ, а в тои боце доспелся ему оубыток на два рубли*" [17, с. 130]. Прыкладна ў 1450 г. палачане выслалі ў Рыгу купцоў, што гандлявалі няякасным селядцом, патрабуючы, каб тых пакаралі па законе, а пацярпелым – выплацілі грошы за ўчыненую шкоду: "*И теперь во есмо послали к вам хвальш в селедцѣх свою братью, и вы бы естѣ тѣхъ хвальшьников казнили по своему праву свѣточно, а нашей братьи вѣлѣли бы естѣ ихъ шкоту заплатити*" [17, с. 184]. Гісторыя паўтараецца і ў 1480-х гг. калі з полацкім купцом Іванам Церашковічам за прададзены попел рыжанін разлічыўся "ліхім селядцом": "*Я ся Микуле у попелъ знаю, алѣ брал есми у Микула товар селедци. А он ми довал за добрыи. А селедци вельми лихы. Оу том ми щъкоды стало много. Хочь ми за то отвѣт дати и за щькоду стояти, а я тобъ попелъ подлуг записи дам*" [18, с. 91].

**Ухіленне ад аплаты тавараў, вяртання пазык і крэдытаў** – двухбаковавостры аспект гандлёвых канфліктаў паміж нямецкімі і полацкімі купцамі, шырока адлюстраваны ў пісьмовых крыніцах XIV – пачатку XVI ст. Напрыклад, "яшчэ ў бытнасць бюргермейстэрам Іагана Зольтрумпа ў 1464 г. баярын Сенько Рыгоравіч недаатрымаў з Германа Зундерна (Жондеря) 50 коп грошай, хоць Рыжская гарадская рада прыняла адмысловае рашэнне пра вяртанне пазыкі. І Сенько Рыгоравіч, і палачане прыклалі нямала высілкаў, каб вярнуць грошы. Сенько Рыгоравіч дабраўся нават да караля, які "*обсылал*" рыжан сваімі лістамі. <…> Аднак і да 1480 г. грошы не былі выплачаны" [8, с. 331]. Сваеасаблівай формай нядобрасумленнага гандлю была і несвоечасовая аплата тавару, якая наносіла прадаўцу значную матэрыяльную шкоду. Так, грамата, накіраваная з Полацка ў Рыгу ў 1465 г., паведамляе: "*…Жаловал нам… мещанин полоцкий на имя Чюрило, ижь там торговал и с вашим мещанином на имя и з Гарманом Герковичом. Дал ему дерево и попел. А имел ему дати Гарман соль на горе в Оспожин день. И запис его на то держить. И он на тот рок не подал ему ничого соли, как с ним торговал. А в том он попал у великую шкоду*" [17, с. 227].

Нягледзячы на тое, што Ганза ў шматлікіх пастановах катэгарычна забараняла гандляваць з рускімі і літоўцамі ў крэдыт, гэтая практыка тавараабароту шырока прымянялася ганзейскімі купцамі ў Полацкіх, Наўгародскіх і Пскоўскіх землях, дзе грашовыя адносіны ў XIII – XIV стст. былі развіты слаба [4, с. 54; 24, с. 102]. Падобная сітуацыя, калі тавары даваліся полацкім гандлёвым партнёрам напавер, магла прыводзіць да злоўжыванняў з боку апошніх. Так, на пачатку XV ст. нямецкія купцы паведамлялі ў Рыгу пра немагчымасць выехаць з Полацку па прычыне таго, што "нашы даўжнікі… яшчэ не прыязджалі, і мы здагадваемся, што яны знарок не з'язджаюцца, каб мы з'ехалі і наш тавар застаўся ў іх у руках" [4, с. 54].

**Нелегальны гандаль**. Фармальна, статус нелегальных гандлёвых аперацый мелі ўсе акты куплі-продажу, што не адпавядалі полацкаму праву, ганзейскім шрагам ці сумесным дамовам. Напрыклад, нелегальным з'яўляўся рознічны продаж тавараў ганзейскімі купцамі ў Полацку, катэгарычна забаронены шматлікімі пастановамі і дамоўленасцямі з Рыгай. Але найбольш рэльефна і паказальна нелегальны гандаль выяўляецца ў дзейнасці падпольных нямецкіх корчмаў у Полацку, якія актыўна займаліся рознічным продажам алкаголю (віна і піва) месцічам у XIV – XV стст. Поўная забарона на ўтрыманне корчмаў немцамі была прадугледжана яшчэ ў 1405 г., што знайшло адлюстраванне ў полацкім праекце гандлёвай дамовы з Рыгай: "*а корчьмы вамъ оу насъ оу Полотьсце не держати*" [17, с. 97]. Аднак канфлікты з выкрыццём падпольных нямецкіх корчмаў у Полацку мелі месца на працягу ўсяго XV ст., што сведчыць, як мінімум, пра дзве акалічнасці, якія спрыялі актыўнаму нелегальнаму гандлю алкагольнымі напоямі ў старажытным беларускім горадзе. Найперш, гэта рэальны і масавы попыт сярод палачан на еўрапейскае віно і піва, а таксама іх цэнавая даступнасць пры рознічнай куплі, калі ў кошт не ўваходзілі акцызы ды мытныя зборы. Другі фактар вынікае з першага і палягае ў тым, што нелегальныя корчмы прыносілі іх уладальнікам добры прыбытак, памеры якога дазвалялі ісці на свядомую рызыку і парушэнне заканадаўства.

У сваю чаргу, Полацк праз падпольны гандаль алкаголем цярпеў значныя грашовыя страты, што стала прадметам вельмі жорсткіх прэтэнзій на адрас Рыгі: "*О томъ пишемъ вамъ, помните вы сами, как вам было с нами докончание, што вамъ было оу нас оу Полоцку корчмы не держати, ни вина на розницю не продавати, а ни пива ни меду, зан же нам от вас стало напасть оу тых корчмах с полтораста рублевъ*" (паміж 1445 – 1448 гг.) [17, с. 153]. У тэксце гэтай жа граматы няцяжка заўважыць адчайныя інтанацыі полацкіх прадстаўнікоў – карныя меры супраць нелегальных нямецкіх гандляроў віном і півам, хутчэй за ўсё, не прыносілі жаданых вынікаў. "*И мы ещо после того, как есмо к вам посылали, досыть ваших дѣтей оунимали, штоб ся они… корчмы бы оу нас не держали, и они не хотели слухать…, как держали корчму оу нас, так держали. И мы оуже болши того не можем терпети. <…> А заказали бы есте своим торговцемъ, штобы и пива к нам не везли, а повезуть пива, и мы хотимъ сами бочкы их рассѣчи и въ Двину оуметати*" [17, с. 153–154]. Але нават такія радыкальныя санкцыі і пагрозы не спынялі нямецкіх гандляроў, якія ў канцы XV ст. прыязджалі ў Полацк не з мэтаю продажу ці куплі тавараў (*не маючи с собою никакое купли*), а менавіта дзеля карчомнага бізнэсу, што вёўся ўжо практычна ў адкрытую: "*…купцы ваши ризскии мешкали у …городе в Полоцку, а не маючи с собою никакое купли, только слышали есмо, што ж завжды корчмы сычивали. А продавали у 20 белец и бочками. <…> И они через то не боючися вашого караньял еще болши того* ***корчмы сытили и продавали не толко тайно, ино явно***" (1487 г.) [18, с. 117]. Аднак ужо ў пачатку XVI ст. скаргі палачан на нелегальныя нямецкія

корчмы практычна не фіксуюцца, што было абумоўлена як агульным згасаннем гандлёвых стасункаў з Ганзай, так і нормамі Магдэбургскага права, нададзенага Полацку ў 1498 г., паводле якіх рознічны гандаль віном ці півам прадугледжваў канфіскацыю ўсяго тавару на карысць горада. "…*И пиво немецкое и инъшее питье чужии бочъкою цѣлою; и того для, тыи купци чужии не будуть смети под меру меншую ни продовати, ни купити, только как вышей выписано; а естли бы которыи своею смелостью иначеи вчинил, тогды тую куплю войт и буръмистры на ратушу возмуть*" [25, с. 59].

**Фальшаванне грошай (фальшываманетніцтва)** стала вянцом у сферы махлярскіх і крымінальных спосаб незаконнага ўзбагачэння, што практыкаваліся ў гандлёвых стасунках паміж Полацкам і Ганзай. "25 студзеня 1493 г. магістр Лівонскага ордэна Фрайтаг фон Ларынгофэн піша ў грамаце да магістра Рэвеля (цяпер – Талін): "Паведамляем вам, што якіясь рускія прыехалі да Рыгі з Полацка, што на Літве, маючы з сабой фальшывыя манеты, бітыя накшталт нашых вендэнскіх, а менавіта – на адным баку герб, а на другім рэвельскі крыж з кропкай. Аднаго з іх злавілі, і той распавёў, што падобных манет выбіта паўласта і яны прывезеныя да нас… І яшчэ, шаноўныя падданыя, гэтыя манеты, падобна, дасланыя з Полацка ў Пскоў, каб пераслаць іх адгэтуль у нашую краіну…" [26, с. 82]. Аб'ём і колькасць падробленых грошай суседняй краіны не можа не ўражваць. "Калі зыходзіць з сярэдняй вагі ордэнскіх шылінгаў гэтага часу (1,00–1,20 г), то ў палове ласта (960 кг) іх павінна было быць ад 800 000 да 960 000 штук!" [9, с. 96]. Нечаканае пацверджанне словам магістра, які абвінавацію палачан у цяжкім фінансавым злачынстве, адбылося ў 1997 г., калі ў Полацку быў выяўлены скарб фальшаваных лівонскіх шылінгаў. Большасць манет скарба разыйшлася па прыватных калекцыях, але 14 фальшывых манет трапілі ў нумізматычны кабінет Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. "Тыпалагічны, стылістычны і палеаграфічны аналізы прывялі да заключэння, што эталонам для іх вырабу паслужылі білонавыя шылінгі магістра Лівонскага ордэна Германа фон Брюггенэя (1535 – 1549) [9, с. 115]. Такім чынам, фальшаванне манет Лівонскага ордэна ў Полацку мела не толькі буйныя маштабы, але амаль 50-гадовую (!) гісторыю. У гэтай сувязі можна выказаць меркаванне, што "падпольным" полацкі манетны двор можна назваць толькі ўмоўна. Доўгачасовая і маштабная падробка шылінгаў наўрацце магла мець індывідуальны і саматужны характар, але, хутчэй за ўсё, планавалася, фундавалася і каардынавалася прыўладнай гарадской вярхушкай, як тое было раней з фальшаваннем воску, дзе актыўны ўдзел прымалі менавіта "баярскія людзі".

Далёка невыпадковым стае і час, калі прагучала рэзанансная справа аб падробцы лівонскіх шылінгаў у Полацку – канец XV – першая палова XVI ст. Бо як раз у гэты перыяд Вялікае Княства Літоўскае актыўна пераймае найноўшыя еўрапейскія тэхналогіі па вырабу манет, і полацкія майстры відавочна былі з імі знаёмыя. Не менш спрыяльнай для фінансавай аферы была і палітычная сітуацыя ва Усходняй Балтыі. Як слушна заўважае Д. Дук, "спрытным людзям было на руку і тое, што Лівонія ўяўляла сабой федэратыўную дзяржаву з рознымі праваўымі нормамі і статусам. У яе склад уваходзіла тэрыторыя Тэўтонскага ордэна са сталіцай у Марбургу (Усходняя Прусія), Лівонскі ордэн са сталіцай у Вэндэне (Латвія), архіепіскапства Рыжскае, епіскапства Дэрптскае, ганзейскі горад Рыга, епіскапства Ляанэскае, ганзейскі горад Рэвель, а таксама комтурства Фелліна і Гаррыена (Эстонія). У такім дзяржаўным утварэнні пры наяўнасці шматузроўневай грашовай сістэмы полацкім махлярам прасцей за ўсё было разлічваць на беспакаранасць" [11, с. 15]. У любым выпадку, эканамічная дыверсія, здзейсненая Полацкам супраць суседняй дзяржавы, не мае аналагаў у беларускай гісторыі.

**Заключэнне**. Гандлёвыя сувязі паміж Полацкам і Ганзейскім саюзам сталі істотным фактарам сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця Беларускага Падзвіння ў XIII – першай палове XVI ст. Аднак, інтэнсіфікацыя міжнароднага гандлю ў рэгіёне суправаджалася як крымінальнымі злачынствамі, так і развіццём разнастайных махлярскіх прыёмаў, што мелі агульную мэту – лёгкае і незаконнае ўзбагачэнне. У той час, як формы гвалту у сферы гандлю заставаліся практычна нязменнымі (забойствы, рабаўніцтва), махлярскія прыёмы (маніпуляцыі з шалямі, фальсіфікацыя тавараў, свядомае ўхіленне ад аплаты тавараў, вяртання пазык і таварных крэдытаў, нелегальны гандаль) пастаянна ўдасканальваліся, нягледзячы на шматлікія дамовы і пагадненні паміж важнейшымі контрагентамі ў рэгіёне – Полацкам і Рыгай. Адной з прычын недабрасумленных адносін паміж полацкімі і нямецкімі купцамі былі ўзаемныя этнастэрэатыпы, суаднесеныя з вобразам "чужынца" і "ворага", што, у сваю чаргу, было абумоўлена перманентнымі ваеннымі канфліктамі паміж Лівонскім ордэнам і Полацкам (Вялікім Княствам Літоўскім). Вяршыняй незаконных гандлёва-фінансавых афер сталася маштабная падробка лівонскіх шылінгаў ў Полацку, якая здзяйснялася на працягу 1490 – 1530-х гг. і, хутчэй за ўсё, насіла характар спланаванай акцыі, скаардынаванай гарадскімі ўладамі ці баярска-купецкай вярхушкай.

## ЛІТАРАТУРА


1. Грамоты, касающиеся до сношений Северо-Западной России с Ригою и ганзейскими городами в XII–XIV вв. / сост. К. Е. Напьерский. – СПб. : Археограф. комиссия, 1857. – 29 с.
2. Напьерский, К.Е. Русско-ливонские акты. / К. Е. Напьерский. – СПб. : Тип. Имп. Академии наук, 1868. – 462 с.
3. Тихомиров, И. Торговые сношения Полоцка с Ливонией в XIV веке / И. Тихомиров // Журнал Министерства народного просвящения. – 1877. – Ч. CXCIV. – С. 232–239.

4. Гильдебранд, Г. Немецкая контора в Полоцке / Г. Гильдебранд // Сборник материалов и статей по истории Прибалтийского края. – Рига : Тип. А. И. Липинского, 1879. – Т. 2. – С. 44–82.
5. Данилевич, В. Е. Очерк истории Полоцкой земли до конца XIV столетия / В. Е. Данилевич. – Киев : тип. Имп. ун-та св. Владимира, 1896. – 288 с.
6. Кулишер, И. М. История русской торговли и промышленности / И. М. Кулишер. – Челябинск : Социум, 2003. – 557 с.
7. Хорошкевич, А. Л. Договоры Полоцка 1405–1406 гг. как источник по истории его внешней торговли и торговой политики / А. Л. Хорошкевич // Археографический ежегодник за 1962 год. – М. : Изд. АН СССР, 1963. – С. 79–87.
8. Хорошкевич, А. Л. Русские грамоты 60–70 годов XV в. из бывшего Рижского городского архива // Археографический ежегодник за 1965 год. – М. : Наука, 1966. – С. 325–341.
9. Рябцевич, В. Н. О чем рассказывают монеты / В. Н. Рябцевич. – Минск : Нар. асвета, 1977. – 399 с.
10. Рябцевич, В. Н. Клады: атрибуция, классификация, интерпретация (этнографическо-нумизматический очерк) / В. Н. Рябцевич // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны. – Вып. 2 / Рэдкал.: С. М. Ходзін (адказ. рэд.) і інш. – Мінск : БДУ, 2005. – С. 104–120.
11. Дук, Д. Большой пожар за две копейки / Д. Дук // Родина. – 2006. – № 4. – С. 14–15.
12. Колобова, И. Клады фальшивых монет / И. Колобова // Банкаўскі веснік. – 2003. – № 31. – С. 20–21.
13. Гулецкий, Д. Новые данные о «полоцких подражаниях» // Банкаўскі веснік. – 2003. – № 34. – С. 61.
14. Жарын, Д. В. Артыкулы экспарту Ганзы з рэгіёна Падзвіння ў XIII–XV ст. / Д. В. Жарын // Лістападаўскія сустрэчы – 5. Праблемы старажытнасці і сярэднявечча: Зборнік артыкулаў па матэрыялах Міжнароднай навуковай канферэнцыі ў гонар акадэмікаў М. М. Нікольскага і У. М. Перцава (13–14 лістапада 2003 г., Мінск) / Навук. рэд. В. А. Фядосік і І. А. Еўтухоў. – Мн.: БДУ, 2005. – С. 140-144.
15. Жарин, Д. В. Ганза и Восточная Европа: торговое и культурное взаимо-действие в XIII–XV веках / Д.В. Жарин // Studia Historica Europae Orientalis. Исследования по истории Восточной Европы. – 2010. – № 3. – С. 102–123.
16. Жарын, Дз. Ганзейскія купцы ў Полацку ў XIII-XV стагоддзях / Дз. Жарын // Беларускі гістарычны часопіс. – 2012. – № 9. – С. 3–10.
17. Полоцкие грамоты XIII – начала XVI в. / сост. А. Л. Хорошкевич. – М. : Ин-т истории СССР АН СССР, 1977. – Вып. 1. – 227 с.
18. Полоцкие грамоты XIII – начала XVI в. / сост. А. Л. Хорошкевич. – М. : Ин-т истории СССР АН СССР, 1978. – Вып. 2. – 220 с.
19. Гуревич, А. Я. Средневековый купец / А. Я. Гуревич // Одиссей. Человек в истории. 1990. – М. : Наука, 1990. – С. 97–131.
20. Памятники русского права. – Вып. 2. Памятники права феодально-раздробленой Руси / Под ред. С. В. Юшкова. – М. : Изд. юридической литературы, 1953. – 442 с.
21. Памятники русского права. – Вып. 1. Памятники права Киевского государства X–XII вв. / Под ред. С. В. Юшкова ; сост. А. А. Зимин. – М. : Госюриздат, 1952. – 288 с.
22. Валодзіна, Т. Барада / Т. Валодзіна, Э. Зайкоўскі // Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка ; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск, 2011. – С. 40–41.
23. Тарасаў, С. В. Полацк у другой палавіне XIII – сярэдзіне XVI стагоддзя / С. В. Тарасаў // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Полацка / Рэд. кал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд) і інш. – Мінск : БелЭн, 2002. – С. 122–132.
24. Валеров, А. В. Кредит в русско-немецкой торговле XIII–XV вв. / А. В. Валеров // Вестн. Санкт-Петербургс. ун-та. Сер. 5. – 2011. – Вып. 3. – С. 100–114.
25. Полоцкие грамоты XIII – начала XVI в. / сост. А. Л. Хорошкевич. – М. : Ин-т истории СССР АН СССР, 1980. – Вып. 3. – 214 с.
26. Гулецкі, Дз. У. Манеты беларускай даўніны / Дз. У. Гулецкі. – Мінск : Беларусь, 2007. – 159 с.

*Паступіў 01.06.2019*

## CRIME AND FRAUD IN TRADE RELATIONS BETWEEN THE POLOTSK AND THE HANSEATIC LEAGUE OF THE XIIIth – EARLY XVIth CENTURY

***U. LOBACH***

*The article discusses various methods of fraud, as well as criminal offenses in the field of international trade between Polotsk and the cities of the Hanseatic League. Throughout the history of trading relationships, the most characteristic crimes have been robbery, theft, manipulation of weights, evasion of the return of monetary debts and commodity loans, falsification of goods and illegal trade, as well as counterfeiting.*

***Keywords:*** *Polotsk, the Hanseatic League, trade, crime, fraud, goods, money.*